

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынская базавая школа”**

Выпуск №6 (31)
Люты 2023

## У нумары:

**Звычайная туркаўка – птушка 2023 года у Беларусі** **Стар. 1**
**Раённы бацькоўскі сход** **Стар. 2**
**15 лютага – Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў** **Стар. 3**
**21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы** **Стар. 4**
**Конкурская праграма да Дня абаронцаў Айчыны** **Стар. 5**
**Шосты школьны дзень** **Стар. 6**

# Звычайная туркаўка – птушка 2023 года ў Беларусі




**5 ФАКТАЎ АБ ПТУШЦЫ ГОДА**

1. Звычайная туркаўка (рус. Обыкновенная горлица) - лясны від, які часцей сустракаецца на поўдні краіны. У Беларусі ўсяго пяць відаў галубоў, акрамя туркаўкі - гэта вяхір, клінтух, шызы голуб і кольчатая галубка.

2. Пералётная птушка, зімуе ў зоне Сахеля - саванным рэгіёне паўднёвей пустыні Сахара.

3. Увесну прылятае позна, калі на дрэвах пачынае распускацца лісце. Адлятае ў Афрыку рана - у пачатку верасня.

4. Песня ў галубкі простая - варкаванне «турр, турр», адсюль беларуская назва віду – туркаўка. Спевы на галінцы або провадзе чаргуецца з такавымі палётамі: самец то ўзлятае, пляскаючы крыламі, уверх, то плануе ўніз.

5. Галубы не вялікія майстры будаваць гнёзды. На галінцы ў плоскую купку складаюць сухія галінкі, пасярэдзіне робяць латок, куды самка адкладае два яйкі.

# Раённы бацькоўскі сход

3 лютага 2023 года законныя прадстаўнікі вучняў прынялі ўдзел у раённым бацькоўскім сходзе **"Павышэнне псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў па пытанні прафілактыкі дзіцячага траўматызму, шкодных звычак у падлеткаў"**. Мерапрыемства проходзіла ў дыстанцыйным рэжыме. На бацькоўскім сходзе выступілі прадстаўнікі розных службаў. Размова ішла аб учыненні дзецьмі супрацьпраўных дзеянняў, галоўным чынам аб распаўсюджванні наркатычных сродкаў непаўналетнімі і аб відах пакарання за ўчыненае.

Акрамя таго размова ішла аб ролі і адказнасці бацькоў. Звярталася ўвага на ролю бацькоў у выхаваўчым працэсе і прафілактыцы правапарушэнняў і злачынстваў, аб адказнасці за паводзіны дзяцей. Таксама гаварылася аб абавязку нашэння флікераў у цёмны час сутак і аб выкананні правілаў дарожнага руху. Размова ішла і аб наяўнасці ў жылых дамах і кватэрах пажарных апавяшчальнікаў.

У рамках бацькоўскага сходу звярталася ўвага бацькоў на кантроль за зносінамі дзяцей у сацыяльных сетках. Асабліва ў Тэлеграм-каналах і ў сацыяльнай сетцы "ВКонтакте". Прагучала просьба да бацькоў сачыць за тым, што дзеці здымаюць і выкладваюць у TikTok.





# 15 лютага – Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў




Штогод 15 лютага ў Рэспубліцы Беларусь адзначаецца Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. У гэты дзень у 1989 годзе апошняя калона савецкіх войскаў пакінула тэрыторыю Аўганістана. Дзевяць гадоў і пяцьдзесят адзін дзень працягваліся жорсткія бітвы ў чужым краі. У неймаверна цяжкіх умовах баявога жыцця, кожную гадзіну падвяргаючыся смяротнай небяспекі, савецкія салдаты захоўвалі вернасць ваеннай прысязе, воінскаму і чалавечаму абавязку.

Час аддаляе нас ад тых падзей. Не стала магутнай дзяржавы, чые інтарэсы абаранялі ў далёкім Афгане і тысячы беларусаў. Аднак, памяць аб вайне па-ранейшаму болем адклікаецца ў сэрцах маці, бацькоў, удоў, дзяцей тых хлопцаў, якія вярталіся дадому "грузам-200".



Гэтай памятнай падзеі была прысвечана інфармацыйная гадзіна ў вучняў 5-6 класаў. Падчас мерапрыемства юнакі і дзяўчаты азнаёміліся з прэзентацыяй **"Афганістан - боль маёй душы"**, праглядзелі відэаролік аб падзеях тых суровых дзён. Затым абмеркавалі ўбачанае і прыйшлі да высновы, што такое не забываецца і што трэба берагчы мір і шанаваць жыццё.

18 лютага вучні нашай школы Сцябуля Дзмітрый і Ярашэвіч Мар'яна прынялі ўдзел у раённым патрыятычным фестывалі **"У кожнага часу свае героі"**, прысвечаным воінам-інтэрнацыяналістам.






# 21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы




Да Міжнароднага дня роднай мовы ў школьнай бібліятэцы прайшла **кніжная выстава.** Увазе хлопчыкаў і дзяўчынак былі прадстаўлены творы беларускіх пісьменнікаў і празаікаў, часопісы, брашуры і газеты, якія змяшчаюць вершы і творы беларускіх аўтараў.

А ў 4 классе прайшла **класная гадзіна "Гучы, мая родная мова"**. Дзеці чыталі вершы, складалі з дапамогай воблака слоў выказванні пра родную мову. З цікавасцю і задавальненнем адгадвалі загадкі, успаміналі прыказкі. Паспрабавалі свае сілы ў гульні "Перакладчыкі".













# Конкурсная праграма да Дня абаронцаў Айчыны

Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны вучні 5-6 класаў прынялі ўдзел у **конкурснай праграме "А ну, хлопчыкі!".**

Дзяўчынкі падрыхтавалі хлопчыкам сапраўдныя выпрабаванні. У конкурсе "Сышчыкі" яны, як сапраўдныя разведчыкі, з завязанымі вачыма шукалі свой абутак, які дзяўчынкі спецыяльна пераблыталі.

Дзеці паспяхова прайшлі выпрабаванні ў конкурсе "Разведка". Яны так удала замаскіраваліся, перапрануўшыся ў казачных герояў, што дзяўчынкам не проста было іх пазнаць.

У конкурсах "Атака", "Выдатны стрэлок", "Лепшы повар" і "Асілак" будучыя абаронцы Айчыны даказалі дзяўчынкам, што здольныя пераадолець нават самыя складаныя выпрабаванні.











# Шосты школьны дзень




У рамках шостага школьнага дня **11 лютага** прадстаўнікі нашай школы прынялі ўдзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных **Дню кнігі**, якія праходзілі ў гімназіі г.Фаніпаля. Вучні ўдзельнічалі ў розных конкурсах, віктарынах, прынялі ўдзел у пасяджэнні Клуба рэдактараў.










Шосты школьны дзень **25 лютага** як заўсёды быў разнастайным і вясёлым. Факультатыўныя заняткі, аб'яднанні па інтарэсах, спартыўныя гульні і многае іншае чакала хлопчыкаў і дзяўчынак. А самым галоўным мерапрыемствам у гэты дзень было **сямейнае свята-кірмаш "Шырокая Масленіца"**.

Падчас мерапрыемства дзеці даведаліся пра гісторыю ўзнікнення свята і пра даўнія народныя традыцыі, звязаныя з яго святкаваннем. Свята атрымалася на славу. Дзеці ўдзельнічалі ў вясёлых гульнях і конкурсах, адгадвалі загадкі, слухалі вершы і песні. Не абышлося свята і без смачных бліноў, прыгатаваных вучнямі разам з бацькамі. Дзеці дружна праводзілі зіму і запрасілі ў госці вясну.







Галоўны рэдактар – Ярашэвіч Мар'яна, вучаніца 8 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 31 сакавіка.
Тыраж – 15 нумароў. Кошт – 1 руб.